Рэспубліканскі конкурс сачыненняў па тэме “Мая Радзіма – Беларусь”

Тэма: “І сняцца сны аб роднай Беларусі…”

Удзельнік: Савіцкая Анастасія

Установа адукацыі: дзяржаўная ўстанова адукацыі “Капцёўская сярэдняя школа” Гродзенскага раёна

Клас: 6

На працягу некалькі гадоў мы з сям'ёй ездзім улетку на адпачынак у розныя краіны. Там прыгожа, весела і цікава. Давялося пабачыць і цёплае марское ўзбярэжжа, і высокія горы, і бязмежныя стэпы, і пясчаныя пустыні з рэдкімі аазісамі.

Чыгуначны вакзал. Гудкі паравозаў, стук вагонных колаў. Бясконцы рух пасажыраў. На гэты раз вяртаемся з падарожжа з Карэліі. Аб’яўляюць пасадку на цягнік… Нас у купэ - чацвёра: тата, мама, я і суседка-спадарожніца даволі сталага ўзросту. Знаёмімся з ёй: звычайная жвавая бабулька, нічога асаблівага ў постаці і рухах, толькі нешта радасна-сумнае ў вачах. Цягнік кранаецца. Мы ўсаджваемся зручней у сваім купэ і знаёмімся бліжэй з суседкай.

Адбіваюць свой меладычны такт колы вагонаў. Бабулька Галя непрыкметна змахвае няпрошаную слязу і пачынае расказваць пра сябе, пра сваю маленькую радзіму. Аказваецца, што наша спадарожніца нарадзілася ў Малой Альшанцы Гродзенскага раёна, там прайшлі яе незабыўныя гады маленства. Як усе вясковыя дзеці, прайшла сельскую навуку жыцця: пасвіла авечак і кароў, працавала ў полі з бацькамі, дапамагала па гаспадарцы. Сям’я вялікая: шасцёра дзяцей. Яна, старэйшая ў сям’і, дапамагала клапаціцца пра малодшых. У пачатку пяцідзясятых гадоў ішло вербаванне моладзі на лесанарыхтоўкі ў Карэлію, вось так і апынулася наша суседка ў далёкім краі, каб запрацаваць “жывых” грошай і дапамагчы сям’і.

А бабулька Галя расказвае нам пра яе (нашу) самую гасцінную беларускую зямлю. Пра наш спагадлівы, працавіты народ, пра самую цудоўную беларускую прыроду, пра Беларусь... Як шмат значыць гэтае слова для яе, і для ўсіх нас. Расказвае пра такія родныя, знаёмыя з дзяцінства краявіды: невялічкую крынічку, з якой бярэ пачатак свавольнік ручэй, салаўіныя пошчакі ў вербалозах. Пра родную хату, у якой нарадзілася, і мілагучную матчыну мову, і сцежку, па якой пайшла ўпершыню, і клёкат буслоў... Бабулька Галя расказвае, расказвае, а слёзы ці то радасці, ці то смутку засцілаюць ёй вочы. Расказвае, што кожную ноч ёй сніцца Малая Альшанка. Бабулька едзе на пабыўку ў родную хату хоць на кароткі час, хоць трошкі падыхаць такім родным паветрам, палюбавацца на “сваіх”, хоць і не знаёмых ужо зараз ёй аднавяскоўцаў.

І чым бліжэй мы пад’язджалі да Беларусі, тым болей упэўніваліся мае бацькі, што жывучы на гэтай чароўнай, багатай беларускай зямлі, за штодзённымі клопатамі мы не заўважаем яе хараства, прывыкаем да ўсёй гэтай прыгажосці. І па-сапраўднаму адчуваем Радзіму толькі ўдалечыні ад яе. Як хочацца тады пачуць гучанне роднай мовы, убачыць роднае неба, удыхнуць роднага паветра, настоенага на суніцах і смалістых хвоях.

Ужо амаль закалыханая пад стук колаў думала я, што лёс падараваў нам такую цудоўную радзіму. Сніліся мне рамонкавы луг, статак кароў, залатое поле з сінімі васількамі. А над усім гэтым - бязвоблачнае неба, у якім лунаў бусел, лілася звонкая песня палявога жаўранка…Снілася мне радзіма, мая родная Беларусь.